Весці БДПУ. Серыя 2. 2020. № 2. С. 18–23

УДК [94(474/476)+ 61(091)]«1919»

# УТВАРЭННЕ І ДЗЕЙНАСЦЬ НАРОДНАГА КАМІСАРЫЯТА АХОВЫ ЗДАРОЎЯ ССР ЛІТВЫ І БЕЛАРУСІ (ЛЮТЫ – ЛІПЕНЬ 1919 г.)

**А. А. Каплієў,**
*кандыдат гістарычных навук, старшы навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі*

UDC [94(474/476)+ 61(091)]«1919»

# CREATION AND ACTIVITY OF THE PEOPLE'S COMMISSARIAT OF HEALTH PROTECTION IN SSR OF LITHUANIA AND BELARUS (FEBRUARY – JULY 1919)

**A. Kapliyev,**
*PhD in History, Senior Researcher of the Institute of History, National Academy of Sciences of Belarus*

Паступіў у рэдакцыю 10.02.20

Received on 10.02.20.

Артыкул характарызуе агульныя тэндэнцыі развіцця аховы здароўя падчас уваходжання беларускіх зямель у склад Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Літвы і Беларусі ў кантэксце фарміравання яе Народнага камісарыята аховы здароўя. На падставе комплексу архіўных крыніц адлюстраваны працэс укаранення асноўных прынцыпаў савецкай медыцыны на тэрыторыі Беларусі, вылучаны перадумовы і этапы развіцця Народнага камісарыята аховы здароўя Літоўска-Беларускай рэспублікі, упершыню вывучаны персаналіі яго кіраўнікоў, а таксама абставіны іх прызначэння. Паказаная пераемнасць дзейнасці Народнага камісарыята аховы здароўя з адпаведным камісарыятам Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусі, структура, кампетэнцыі і асноўныя кірункі дзейнасці ў кантэксце пачатку баявых дзеянняў польска-савецкай вайны 1919–1921 гг., эвакуацыі і паступовай ліквідацыі ўрадавых органаў Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Літвы і Беларусі.

*Ключавыя словы:* Сацыялістычная Савецкая Рэспубліка Літвы і Беларусі, Народны камісарыят аховы здароўя, польска-савецкая вайна 1919–1921, медыцына, эпідэміі.

The article characterizes general tendencies of development of health protection during joining of Belarusian lands to the Socialistic Soviet Republic of Lithuania and Belarus in the context of forming its People's commissariat on health protection. On the base of a complex of archive sources the process of implanting of the main principles of Soviet medicine in the territory of Belarus is reflected, the premises and stages of development of People's commissariat on health protection of Lithuanian-Belarusian republic are defined, the personnel of its leadership and the circumstances of their appointment are studied for the first time. The paper shows sustainability of the activity of People's commissariat on health protection with the corresponding commissariat of Socialistic Soviet Republic of Belarus, structure, competencies and the main directions of activity in the context of the beginning of the battle actions of the Polish-Soviet war in 1919-1921, evacuation and gradual elimination of authorities of Socialistic Soviet Republic of Lithuania and Belarus.

*Keywords:* Socialistic Soviet Republic of Lithuania and Belarus, People's commissariat on health protection, Polish-Soviet war 1919–1921, medicine, epidemics.

*Уводзіны.* Пытанні арганізацыі аховы здароўя падчас станаўлення ўлады бальшавікоў на тэрыторыі Беларусі звычайна саступаюць у ступені навуковай распрацаванасці іншым праблемам савецкага дзяржаўнага будаўніцтва. Нешматлікія публікацыі па гэтай тэме належаць гісторыкам медыцыны М. Абраменка і Я. Ціішчанка, аднак нават грунтоўныя даследаванні не змяшчаюць характарыстыку стану аховы здароўя на тэрыторыі Беларусі падчас яе ўваходжання ў склад Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Літвы і Беларусі (ЛітБел) [1, с. 35; 2, с. 192,193]. Дадзены артыкул характарызуе фарміраванне і дзейнасць Народнага камісарыята аховы здароўя ЛітБел у пачатку 1919 г., калі мерапрыемствы па арганізацыі медыцынскага забеспячэння былі ўскладнены пачаткам польска-савецкай вайны 1919–1921 гг.

*Асноўная частка.* На момант усталявання на тэрыторыі Беларусі савецкай улады ахова здароўя знаходзілася ў заняпадзе з-за наступстваў Першай сусветнай вайны (1914–1918 гг.). Дарэвалюцыйная лячэбная сетка была ў значнай ступені разбурана, а асноўная дапамога насельніцтву аказвалася медыцынскімі ўстановамі дабрачынных таварыстваў: Усерасійскага земскага саюза, Усерасійскага саюза гарадоў, Расійскага таварыства Чырвонага Крыжа і інш. [3, с. 29].

З атрыманнем улады бальшавікамі пачалася рэалізацыя мерапрыемстваў па пабудове новай сістэмы аховы здароўя, заснаванай на прынцыпах агульнадаступнасці, кваліфікаванасці і бясплатнасці з апорай на прафілактыку сацыяльных хвароб і шырокую санітарную асвету насельніцтва. Уся сістэма падначальвалася адзінаму кіруючаму органу – Народнаму камісарыяту аховы здароўя (НКАЗ), які быў упершыню створаны ў Маскве 11 ліпеня 1918 г. На месцах палітыку НКАЗ праводзілі губернскія, павятовыя і гарадскія аддзелы аховы здароўя, якія мелі падвойнае падначаленне – НКАЗ і свайму выканаўчаму камітэту [4, арк. 37].

Першыя спробы арганізацыі Народнага камісарыята аховы здароўя на тэрыторыі Беларусі адносяцца да пачатку 1918 г. Аднак наступ германскіх войскаў і акупацыя большай часткі краіны перакрэслілі гэтыя ініцыятывы, а Камісарыят аховы здароўя быў створаны ўжо пасля абвяшчэння Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусі (ССРБ), у складзе яе Часовага рабоча-сялянскага савецкага ўрада ў студзені 1919 г. [5, с. 182].

Камісарыят быў пабудаваны па ўзоры НКАЗ РСФСР, а яго загады і пастановы былі ў абсалютнай большасці складзены на падставе адпаведных прававых актаў РСФСР [6, с. 107, 108]. Узначаліў Камісарыят

аховы здароўя ССРБ І. Пузыроў – малады камуніст беларускага паходжання, які зусім не меў досведу ў арганізацыі аховы здароўя, а па родзе заняткаў з’яўляўся народным настаўнікам [7, с. 107, 108; 8, с. 177, 178].

Аднак Камісарыят аховы здароўя разам з дзяржавай, якой ён належаў, праіснавалі нядоўга: у лютым 1919 г. ССРБ была аб’яднана з Літоўскай ССР і такім чынам стварылася новая ССР Літвы і Беларусі са сталіцай у Вільні. 27 лютага 1919 г. у Вільні адбылося ўрачыстае пасяджэнне Цэнтральнага выканаўчага камітэта (ЦВК) ССРБ і Літоўскай ССР, дзе быў абраны Прэзідыум ЦВК ЛітБел на чале з К. Цэхоўскім [10, с. 168]. У адрозненне ад ССРБ урад ЛітБел атрымаў назву Савета Народных Камісараў (СНК), у складзе якога быў вылучаны і асобны Народны камісарыят аховы здароўя [11, с. 35].

Пры гэтым на тэрыторыі Мінскай губерні 25 лютага 1919 г. быў створаны фактычна аўтаномны Мінскі губернскі рэвалюцыйны камітэт, улада якога распаўсюджвалася на ўсе паветы Мінскай губерні, а таксама Вілейскі павет Віленскай губерні. У складзе гэтага ўладнага органа быў вылучаны асобны медыка-санітарны аддзел [12, с. 112, 113].

Нягледзячы на гэта, у Мінску працягваў існаванне таксама і Камісарыят аховы здароўя ССРБ, які быў расфарміраваны толькі 15 сакавіка 1919 г. З-за адсутнасці кадравай базы для разгортвання працы НКАЗ у Вільні частка супрацоўнікаў мінскага камісарыята была адкамандзіравана ў штат новаўтворанага НКАЗ ЛітБел [13, арк. 39]. Пры фарміраванні будучага ўраду ЛітБел былы камісар аховы здароўя ССРБ І. Пузыроў застаўся ў структуры і быў вылучаны ў склад калегіі НКАЗ, аднак па пасадзе наркама вызначанасці не было: у пратаколе пасяджэння Цэнтральнага бюро КП(б)Б, дзе вырашаліся пытанні кандыдатур кіраўнікоў наркаматаў, па Народным камісарыяце аховы здароўя было напісана – «з цэнтру» (гэта азначала, што будучы кіраўнік будзе прызначаны асобна) [14, арк. 34 адв.]. Пры канчатковым фарміраванні камісарыята на пасаду яго кіраўніка быў вылучаны вядомы літоўскі афтальмолаг П. Авіжоніс [15, с. 75].

Удзельнік руска-японскай і Першай сусветнай войнаў, дасведчаны лекар, доктар медыцыны, вядомы публіцыст і дзеяч літоўскага рэвалюцыйнага руху, паплечнік старшыні СНК ЛітБел В. Міцкявічуса-Капсукаса 43-гадовы загадчык аддзела аховы здароўя Шаўляйскага савета П. Авіжоніс бачыўся ўдалай заменай І. Пузырову на пасадзе наркама аховы здароўя. Прызначэнне было абвешчана 1 сакавіка 1919 г., аднак ніякіх звестак аб дзейнасці П. Авіжоніса на гэтай пасадзе няма [15, с. 86–95].

Зыходзячы з аналізу архіўных дакументаў, можна з высокай доляй верагоднасці сцвярджаць, што, нягледзячы на заклікі збоку кіраўніка ўраду ЛітБел В. Міцкявічуса-Капсукаса, П. Авіжоніс сваю пасаду так і не заняў [17, арк. 10]. Шэраг даследчыкаў лічыць, што П. Авіжоніс проста адмовіўся ад прапановы В. Міцкявічуса-Капсукаса [18, p. 15–18]. Асобныя крыніцы сцвярджаюць, што ён не свядома пазбягаў кіраўніцтва аховай здароўя Літоўска-Беларускай рэспублікі, проста не змог фізічна дабрацца ў Вільню ў цяжкіх умовах пачатку баявых дзеянняў польска-савецкай вайны 1919–1921 гг. [15, с. 95].

Ускосныя звесткі сведчаць аб прызначэнні на пасаду камісара аховы здароўя ЛітБел іншага літоўскага лекара – А. Дамашавічуса, аднак архіўныя дакументы пацвярджаюць, што фактычным кіраўніком НКАЗ заставаўся І. Пузыроў [5, с. 185; 19, с. 78].

30 сакавіка 1919 г. на пасаду наркама аховы здароўя быў запрошаны доктар У. Ленскі, які працаваў у Маскоўскім камітэце па справах палонных і ўцекачоў, але да яго прыбыцця абавязкі наркама зноў былі ўскладзены на І. Пузырова [21, с. 14]. Аднак і пасля прыбыцця новага ўпраўленцы фактычная праца працягвала весціся пад кіраваннем І. Пузырова: большасць загадаў НКАЗ ЛітБел за сакавік – май 1919 г. была падпісана менавіта ім.

Пасля пераезду ў Вільню фактычны кіраўнік НКАЗ ЛітБел І. Пузыроў рашуча праводзіў лінію на нацыяналізацыю медыцынскіх рэсурсаў, перш за ўсё лекавых сродкаў, што было ў значнай ступені выканана на беларускіх землях і ў меншай – у Літве [17, арк. 18 адв.]. Аднак першапачатковая нацыяналізацыя лекаў была прадыктавана не толькі бальшавіцкай палітыкай, але і надзённай неабходнасцю – падчас баявых дзеянняў беларускія і літоўскія землі сутыкнуліся з моцнай хваляй інфекцыйных хвароб, што ўскладнялі і без гэтага адчайнае становішча новай рэспублікі, якую крок за крокам захоплівалі польскія войскі. У мэтах барацьбы з інфекцыямі 2 красавіка 1919 г. СНК ЛітБел прыняў рашэнне аб пабудове сеткі грамадскіх лазняў і арганізацыі санітарных атрадаў, на што было вылучана 500 тыс. руб. [11, с. 61].



Іларыён Пузыроў [9]



Пятрас Авіжоніс [16, p. 4]



Андрыс Дамашавічус [20]

Аднак арганізаваць супрацьэпідэмічныя мерапрыемствы ў наркамата фактычна не было часу: у сувязі з адыходам бальшавікоў з Вільні і далейшым наступам польскага войску ўрад ЛітБел 21 красавіка 1919 г. пераехаў у Дзвінск, а 28 красавіка – у Мінск [11, с. 103; 22, с. 383].

Пры перасоўванні ў Мінск народныя камісарыяты ЛітБел не стваралі новых апаратаў, а інкарпаравалі ў свой склад адпаведныя па функцыях установы Мінскага губернскага рэвалюцыйнага камітэта [13, арк. 82]. Не стаў выключэннем і НКАЗ ЛітБел, які быў нанова арганізаваны 30 красавіка 1919 г. на падмурку Мінскага губернскага медыка-санітарнага аддзела з пераўтварэннем яго аддзелаў у адпаведныя структуры НКАЗ, а секцый – у пададдзелы [23, с. 321]. Новы НКАЗ ужо афіцыйна ўзначаліў І. Пузыроў. Яшчэ ў красавіку 1919 г. фармальна ён толькі выконваў абавязкі наркама, аднак у маі заняў былую пасаду на пастаяннай аснове [17, арк. 21–22]. Пасля пераезду ў Мінск з былой калегіі Мінскага губернскага аддзела аховы здароўя была створана адпаведная структура, але ўжо як дарадчы орган пры наркаме [13, арк. 84].

У межах укаранення савецкай сістэмы аховы здароўя прадугледжвалася скасаванне дарэвалюцыйнай («земскай») мадэлі медыцыны, якая лічылася накіраванай на абслугоўванне выключна «заможных». Таму з 9 мая 1919 г. па загадзе НКАЗ ЛітБел усе падначаленыя яму лячэбныя ўстановы пераймяноўваліся з «земскіх» у «савецкія», што не адлюстроўвала ніякіх змен, але павінна было ўсяліць упэўненасць у незваротных пераўтварэннях бальшавіцкай улады на карысць працоўных і сялян [13, арк. 88].

Першым і галоўным рэальным рэалізаваным захадам на новым месцы стала актывізацыя мерапрыемстваў па барацьбе з эпідэміямі: загадам НКАЗ № 5 ад 10 мая 1919 г. санкцыянавалася стварэнне новых санітарна-эпідэмічных атрадаў, якія не толькі змагаліся з эпідэміямі, але і аказвалі насельніцтву ўсю магчымую медыцынскую дапамогу [13, арк. 89 адв.].

Аднак у цэлым рэальнае становішча медыцыны толькі пагаршалася, а ўсе інавацыі дыктаваліся выключна патрабаваннямі ваеннага часу. Ва ўмовах працягу баявых дзеянняў польска-савецкай вайны 1919–1921 гг. цывільная і ваенная ахова здароўя фактычна перастала падзяляцца: 22 мая 1919 г. Савет абароны Літвы і Беларусі абвясціў усе цывільныя медыка-санітарныя і лячэбныя ўстановы на палажэнні ваенна-лячэбных, а ўвесь медыцынскі персанал – вайскоўцамі. З гэтага моманту ніводны медыцынскі супрацоўнік не меў права пакідаць сваё месца жыхарства і працы без дазволу НКАЗ ці падначаленых яму аддзелаў [24, с. 4]. Трэба адзначыць, што ва ўмовах абвешчанай працоўнай павіннасці лекарам даводзілася працаваць па 16 гадзін, пры гэтым аплата працы медыкаў не адпавядала іх элементарным жыццёвым патрабаванням [25, арк. 94].

Далейшы наступ польскіх войскаў абумовіў прыняцце рашэння аб пераездзе ўрадавых устаноў з Мінску, таму 24 мая 1919 г. НКАЗ ЛітБел быў эвакуіраваны ў Бабруйск, у той час як большасць шпіталяў – адразу ў Смаленск, як мага далей ад фронту [7, с. 46, 86]. Ва ўмовах сталай ваеннай небяспекі і з'яўлення новых выклікаў структура першых савецкіх камісарыятаў часцяком змянялася. Не стаў выключэннем і НКАЗ ЛітБел, які пасля эвакуацыі быў фактычна падзелены на дзве часткі:

1) «Палявое аддзяленне» НКАЗ, якое засталося ў Мінску і займалася патрэбамі фронту, эвакуацыяй лячэбных устаноў і запасаў лекаў пад кіраўніцтвам зноў прызначанага наркамам У. Ленскага;

2) непасрэдна НКАЗ, што дзейнічаў у Бабруйску і вёў асноўную працу на чале з І. Пузыровым, які фармальна апынуўся намеснікам наркама.

Такім чынам, асноўным цэнтрам развіцця медыцыны ЛітБел стаў Бабруйск. Адносна спакойнае становішча ва ўмовах аддаленасці ад фронту дазволіла наладзіць эфектыўную працу, стварыць паўнавартасную структуру пададдзелаў НКАЗ, спарадкаваць працу медыцынскіх устаноў на ўзроўні паветаў. Падчас найбольшага росквіту сваёй дзейнасці НКАЗ ЛітБел складаўся з 12 аддзелаў з 42 пададдзеламі і адной секцыі, усяго – 163 штатныя адзінкі (рысунак) [5, с. 187].

Аднак у сувязі з акупацыяй большай часткі тэрыторыі ЛітБел паўстала пытанне аб ліквідацыі яе ўстаноў, якая пачалася са скарачэння апаратаў наркаматаў да 20 % штату. Паступова наркаматы ЛітБел былі перададзены ў склад Мінскага губернскага рэвалюцыйнага камітэта, які з 19 ліпеня 1919 г. фактычна пераняў функцыі ўрада ЛітБел [7, с. 46, 90, 91].

Народны камісарыят аховы здароўя ЛітБел фармальна праіснаваў да 25 ліпеня 1919 г., калі разам з астатнімі камісарыятамі рэспублікі быў перайменаваны ў аддзел Мінскага губернскага рэвалюцыйнага камітэта [12, с. 176, 177]. Нягледзячы на назву, гэты орган фактычна знаходзіўся ў Бабруйску і абвясціў сябе носьбітам дзяржаўнай улады на ўсёй неакупаванай тэрыторыі ЛітБел. Пераемнасць у справе фарміравання сістэмы аховы здароўя была падкрэслена тым фактам, што ў складзе Мінскага губернскага рэвалюцыйнага камітэта былы фактычны кіраўнік НКАЗ ЛітБел І. Пузыроў 5 жніўня 1919 г. быў зацверджаны на пасаду загадчыка аддзела аховы здароўя [7, с. 46, 92; 11, с. 122, 123].

*Заключэнне.* Падсумоўваючы вышэйпададзенае трэба адзначыць, што дзейнасць Народнага камісарыята аховы здароўя ЛітБел з'яўлялася арганічным працягам палітыкі адпаведнага камісарыята ССРБ і ў сваю чаргу працягвала рэалізоўвацца аддзелам аховы здароўя Мінскага губернскага рэвалюцыйнага камітэта. Нягледзячы на ўсе дэклараваныя мерапрыемствы і наладжаную структуру, дзейнасць НКАЗ ЛітБел дыктавалася выключна патрэбамі ваеннага часу, а цяжкае для савецкіх войскаў становішча на фронце абумовіла недасканаласць і незавершанасць большасці запланаваных мерапрыемстваў. Тым не менш, досвед працы камісарыята стаў карысным для беларускіх медыкаў, а сам цэнтральны распарадчы орган кіравання аховай здароўя быў адроджаны яшчэ да заканчэння польска-савецкай вайны разам з другім абвяшчэннем ССРБ.




*Рысунак – Структура Народнага камісарыята аховы здароўя ССР Літвы і Беларусі ў 1919 г.*

*Літаратура*

1. *Абраменко, М. Е.* Роль Наркомздрава РСФСР в развитии здравоохранения Беларуси / М. Е. Абраменко // Вестник Ярославского государственного университета им. П. Г. Демидова. Серия Гуманитарные науки. – 2014. – № 2 (28). – С. 35–39.
2. *Тищенко, Е. М.* Утверждение «Модели Семашко» в здравоохранении Беларуси в начале 1920-х годов / Е. М. Тищенко // Бюллетень Национального научно-исследовательского института общественного здоровья имени Н. А. Семашко. – 2014. – № 1. – С. 192–195.
3. *Балковец, С. В.* Первые шаги советского здравоохранения в Белоруссии (воспоминания участника) / С. В. Балковец // Беларуская мэдычная думка. – 1927. – № 9–12. – С. 28–33.
4. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці. – Ф. 64. Воп. 1. Спр. 137.
5. *Крючок, Г. Р.* Создание Народного комиссариата здравоохранения БССР и его начальная деятельность в 1919 г. / Г. Р. Крючок // Сборник научных трудов (кафедры общественных наук) / Минский государственный медицинский институт. – Минск : Государственное издательство БССР, 1958. – Т. 22. – С. 180–193.
6. Пастанова № 2 Часоваго Работніча-Селянскага Савецкага (Беднаго) Правіцельства на Беларусі // Весткі Часоваго Работніча-Сялянскага Радаваго (Советского) Ураду Беларусі. – 1919. – № 1. – С. 1.
7. История государства и права Белорусской ССР: в 2 т. Т. 1 (1917–1936 гг.) / ред. С. П. Маргунский [и др.]. – Минск : Наука и техника, 1970. – 608 с.
8. 1 января 1919 года: Временное рабоче-крестьянское советское правительство Белоруссии : док. и материалы / сост. В. Д. Селеменев (рук.) [и др.] ; науч. ред. М. Ф. Шумейко. – Минск : Лимариус, 2005. – 304 с.
9. Музей Паўднёва-расійскага дзяржаўнага політэхнічнага ўніверсітэта імя М. І. Платава, калекцыя, прысвечаная І. І. Халецкаму-Пузырову. – б/н.
10. История белорусской государственности : в 5 т. / А. А. Коваленя [и др.] ; Нац. акад. наук Беларуси, Ин-т истории. – Минск : Беларус. навука, 2019. – Т. 3. Белорус. государственность : от идеи к национальному государству (1917–1939 гг.) – 639 с.
11. *Шкляр, Е. Н.* Борьба трудящихся Литовско-Белорусской ССР с иностранными интервентами и внутренней контрреволюцией (1919–1920) / Е. Н. Шкляр. – Минск : Государственное издательство БССР, 1962. – 177 с.
12. Революционные комитеты БССР (ноябрь 1918 г. – июль 1920 г.). Сборник документов и материалов. – Минск : Изд-во Академии наук Белорусской ССР, 1961. – 459 с.
13. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 808. Воп. 1. Спр. 4.
14. НАРБ. – Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 8.
15. *Сюдикас, В. П.* Офтальмолог П. Авижонис – воспитанник Тартуского университета / В. П. Сюдикас, В. В. Калнин // Tartu Ülikooli Ajaloo Küsimusi VI (TRÜ ajaloo komisjoni materjalid). – Tartu, 1977. – С. 86–97.
16. *Avižonis, P.* Akių ligų vadovas / P. Avižonis. – Kaunas : Lietuvos universiteto Medicinos fakultetas, 1940. – 844 p.
17. НАРБ. – Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 32.
18. *Gaigalaitė, A.* Petras Avižonis / A. Gaigalaitė // Žiemgala. – 1998. – Nr 1. – P. 15–18.
19. *Пантюк, И. В.* Министры здравоохранения Беларуси: 1919–2011 гг. / И. В. Пантюк // Современная стоматология. – 2012. – № 1. – С. 78–83.
20. Беларускі дзяржаўны архіў кінафотафонадакументаў. – № Е022259.
21. *Крючок, Г. Р.* Здравоохранение Белоруссии в период начального строительства Белорусской ССР (декабрь 1918 – август 1919 г.) / Г. Р. Крючок // Сборник научных трудов (кафедры общественных наук) / Минский государственный медицинский институт. – Минск : Государственное издательство БССР, 1958. – Т. 21. – С. 13–24.

*References*

1. *Abramenko, M. E.* Rol' Narkomzdrava RSFSR v razvitii zdravoohraneniya Belarusi / M. E. Abramenko // Vestnik Yaroslavskogo gosudarstvennogo universiteta im. P. G. Demidova. Seriya Gumanitarnye nauki. – 2014. – № 2 (28). – S. 35–39.
2. *Tishchenko, E. M.* Utverzhdenie «Modeli Semashko» v zdravoohranenii Belarusi v nachale 1920-h godov / E. M. Tishchenko // Byulleten' Nacional'nogo nauchno-issledovatel'skogo instituta obshchestvennogo zdorov'ya imeni N. A. Semashko. – 2014. – № 1. – S. 192–195.
3. *Balkovec, S. V.* Pervye shagi sovetskogo zdravoohraneniya v Belorussii (vospominaniya uchastnika) / S. V. Balkovec // Belaruskaya medychnaya dumka. – 1927. – № 9–12. – S. 28–33.
4. Dzyarzhaŭny arhiŭ Vicebskaj voblasci. – F. 64. Vop. 1. Spr. 137.
5. *Kryuchok, G. R.* Sozdanie Narodnogo komissariata zdravoohraneniya BSSR i ego nachal'naya deyatel'nost' v 1919 g. / G. R. Kryuchok // Sbornik nauchnyh trudov (kafedry obshchestvennyh nauk) / Minskij gosudarstvennyj medicinskij institut. – Minsk : Gosudarstvennoe izdatel'stvo BSSR, 1958. – T. 22. – S. 180–193.
6. Pastanova № 2 Chasovago Rabotnicha-Selyanskago Saveckago (Bednago) Pravicel'stva na Belarusi // Vestki Chasovago Rabotnicha-Syalyanskago Radavago (Sovetskogo) Uradu Belarusi. – 1919. – № 1. – S. 1.
7. Istoriya gosudarstva i prava Belorusskoj SSR: v 2 t. T. 1 (1917–1936 gg.) / red. S. P. Margunskij [i dr.]. – Minsk : Nauka i tekhnika, 1970. – 608 s.
8. 1 yanvarya 1919 goda: Vremennoe raboche-krest'yanskoe sovetskoe pravitel'stvo Belorussii : dok. i materialy / sost. V. D. Selemenev (ruk.) [i dr.] ; nauch. red. M. F. Shumejko. – Minsk : Limarius, 2005. – 304 s.
9. Muzej Paŭdnyova-rasijskaga dzyarzhaŭnaga politekhnichnaga ŭniversiteta imya M. I. Platava, kalekcyya, prysvechanaya I. I. Haleckamu-Puzyrovu. – b/n.
10. Istoriya belorusskoj gosudarstvennosti : v 5 t. / A. A. Kovalenya [i dr.] ; Nac. akad. nauk Belarusi, In-t istorii. – Minsk : Belarus. navuka, 2019. – T. 3. Belorus. gosudarstvennost' : ot idei k nacional'nomu gosudarstvu (1917–1939 gg.) – 639 s.
11. *Shklyar, E. N.* Bor'ba trudyashchihsya Litovsko-Belorusskoj SSR s inostrannymi interventami i vnutrennej kontrrevolyuciej (1919–1920) / E. N. Shklyar. – Minsk : Gosudarstvennoe izdatel'stvo BSSR, 1962. – 177 s.
12. Revolyucionnye komitety BSSR (noyabr' 1918 g. – iyul' 1920 g.). Sbornik dokumentov i materialov. – Minsk : Izd-vo Akademii nauk Belorusskoj SSR, 1961. – 459 s.
13. Nacyyanal'ny arhiŭ Respubliki Belarus' (NARB). – F. 808. Vop. 1. Spr. 4.
14. NARB. – F. 4p. Vop. 1. Spr. 8.
15. Syudikas, V. P. Oftal'molog P. Avizhonis – vospitannik Tartuskogo universiteta / V. P. Syudikas, V. V. Kalnin // Tartu Ülikooli Ajaloo Küsimusi VI (TRÜ ajaloo komisjoni materjalid). – Tartu, 1977. – S. 86–97.
16. *Avižonis, P.* Akių ligų vadovas / P. Avižonis. – Kaunas : Lietuvos universiteto Medicinos fakultetas, 1940. – 844 p.
17. NARB. – F. 4p. Vop. 1. Spr. 32.
18. *Gaigalaitė, A.* Petras Avižonis / A. Gaigalaitė // Žiemgala. – 1998. – Nr 1. – P. 15–18.
19. *Pantyuk, I. V.* Ministry zdravoohraneniya Belarusi: 1919–2011 gg. / I. V. Pantyuk // Sovremennaya stomatologiya. – 2012. – № 1. – S. 78–83.
20. Belaruski dzyarzhaŭny arhiŭ kinafotafonadakumentaŭ. – № E022259.
21. *Kryuchok, G. R.* Zdravoohranenie Belorussii v period nachal'nogo stroitel'stva Belorusskoj SSR (dekabr' 1918 – avgust 1919 g.) / G. R. Kryuchok // Sbornik nauchnyh trudov (kafedry obshchestvennyh nauk) / Minskij gosudarstvennyj medicinskij institut. – Minsk : Gosudarstvennoe izdatel'stvo BSSR, 1958. – T. 21. – S. 13–24.

22. *Ціхаміраў, А.* Літоўска-Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка / А. Ціхаміраў // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. – Мінск : Беларус. энцыкл. імя П. Броўкі, 1993–2003. – Т. 4. – 1997. – С. 382–384.
23. Органы государственной власти и управления Советской Беларуси (1917–1920 гг.) : справочник / сост. : М. К. Бобер [и др.]. – Минск : БелНИИДАД, 2017. – 466 с.
24. Звезда. – 1919. – № 445 (24 мая).
25. Дзяржаўны архіў Гомельскай вобласці. – Ф. 11. Воп. 1. Спр. 757.

22. *Cihamiraŭ, A.* Litoŭska-Belaruskaya Saveckaya Sacyyalistychnaya Respublika / A. Cihamiraŭ // Encyklapedyya gistoryi Belarusi : u 6 t. – Minsk : Belarus. encykl. imya P. Broŭki, 1993–2003. – T. 4. – 1997. – S. 382–384.
23. Organy gosudarstvennoj vlasti i upravleniya Sovetskoj Belarusi (1917–1920 gg.) : spravochnik / sost. : M. K. Bober [i dr.]. – Minsk : BelNIIDAD, 2017. – 466 s.
24. Zvezda. – 1919. – № 445 (24 maya).
25. Dzyarzhaŭny arhiŭ Gomel'skaj voblasci. – F. 11. Vop. 1. Spr. 757.